**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Калектарная, 10, 220004, г. Мінск
Тэл./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул. Коллекторная, 10, 220004, г. Минск
Тел./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

14.04.2009г. № 06-14/883

На № 5/4 от 12.03.2009г.

Садоўскаму Дз.В.
(для Нацыянальнай Рады
Партыі Беларуская
Хрысціянская Дэмакратыя)

Аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі
палітычнай партыі

Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь разгледжаны матэрыялы адносна дзяржаўнай рэгістрацыі Партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя (далей – Партыя БХД). Пры іх вывучэнні было ўстаноўлена наступнае.

Заява ад 12.03.2009 і іншыя дакументы аб дзяржаўнай рэгістрацыі Партыі БХД сведчаць, што на Устаноўчым З'ездзе, які адбыўся 28.02.2009 у г. Мінску, прынята рашэнне аб стварэнні Партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя.

Агульная колькасць заснавальнікаў Партыі БХД згодна з прадстаўленым спісам заснавальнікаў дадзенай партыі састаўляе 1071 чалавек.

Ініцыятыўнай групай па стварэнні Партыі БХД 17.01.2009 было прынята рашэнне аб правядзенні сходаў заснавальнікаў палітычнай партыі па тэрытарыяльнай прыкмеце для вылучэння дэлегатаў на Устаноўчы З'езд, а таксама вызначана норма прадстаўніцтва па аднаму дэлегату ад кожных пяці заснавальнікаў партыі.

Згодна пратаколу Устаноўчага З'езду Партыі БХД ад 28.02.2009 №1 і пратаколу мандатнай камісіі ад 28.02.2009 №2, на Устаноўчы З'езд Партыі БХД было вылучана 206 дэлегатаў і ўсе яны прысутнічалі на Устаноўчым З'ездзе. Разам з тым, у прадстаўленым спісе прысутных, які дадаецца ў дадатку да пратакола Устаноўчага З'езду Партыі БХД, значыцца толькі 205 асоб.

Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь былі прааналізаваны атрыманыя ад асобаў, указаных у спісе заснавальнікаў Партыі БХД,

пісьмовыя адказы на адпаведныя запыты. У выніку гэтага аналіза ўстаноўлена, што на сходзе заснавальнікаў Партыі БХД ад Гродзенскай вобласці (пратакол ад 21 лютага 2009 г. №1) грамадзянін Чычыкайла А.М. (у спісе заснавальнікаў Партыі БХД значыцца пад №716) не прысутнічаў. Грамадзянін Ількевіч А.Я., які указаны ў ліку прысутных азначанага вышэй схода, не значыцца у спісе заснавальнікаў Партыі БХД. Грамадзянін Пяцельчыц В.Ч. (у спісе заснавальнікаў Партыі БХД значыцца пад №676) паведаміў, што ён прысутнічаў на сходзе заснавальнікаў Партыі БХД, які праходзіў у лютым 2009 г. у г. Свіслач, а не ў г. Гродна, як гэта ўказана ў азначаным вышэй пратаколе. Грамадзянін Кіркевіч А.Р. (у спісе заснавальнікаў Партыі БХД значыцца пад №670) указаў, што сход заснавальнікаў Партыі БХД, на якім ен прысутнічаў, праводзіўся 3 лютага 2009 г. у г. Гродна, а не 21 лютага 2009 г., як гэта ўказана ў пратаколе схода заснавальнікаў Партыі БХД Гродзенскай вобласці. Ён жа ўказаў, што ў якасці дэлегатаў на Устаноўчы З'езд Партыі БХД было абрана 4 чалавека: Баўсюк М., Улейчык П., Пацэвіч Я. і Лялевіч І. Але згодна з пратаколам схода заснавальнікаў Партыі БХД ад Гродзенскай вобласці ад 21.02.2009 г. №1 на Устаноўчы З'езд Партыі БХД былі абраны 8 дэлегатаў. Грамадзянін Кіркевіч А.Р. паведаміў таксама аб колькасці прысутных заснавальнікаў Партыі БХД каля 20 чалавек, але не 40, як гэта ўказана ў пратаколе схода заснавальнікаў Партыі БХД Гродзенскай вобласці ад 21.02.2009 №1.

Устаноўлена таксама, што грамадзянін Гарбачоў Ю.А. (у спісе заснавальнікаў Партыі БХД значыцца пад №110) на сходзе заснавальнікаў Партыі БХД Першамайскага раёна г. Мінска (пратакол ад 11.02.2009 г. №1) не прысутнічаў і заснавальнікам Партыі БХД не з'яўляецца.

Грамадзянка Шыбут А.П. (у спісе заснавальнікаў Партыі БХД значыцца пад №386) на сходзе заснавальнікаў Партыі БХД ад Мінскай вобласці (пратакол ад 22.02.2009 г. №1) не прысутнічала.

Грамадзяне Ляждзей К.К. (у спісе заснавальнікаў Партыі БХД значыцца пад №645) і Вільхавая Л.М. (у спісе заснавальнікаў Партыі БХД значыцца пад №922) не змаглі назваць месца і дату правядзення схода заснавальнікаў Партыі БХД, на якіх яны прысутнічалі, колькасць заснавальнікаў, што прысутнічалі на гэтых сходах, а таксама не змаглі назваць дэлегатаў, вылучаных на Устаноўчы З'езд Партыі БХД.

Грамадзянін Валькевіч А.Дз. (у спісе заснавальнікаў Партыі БХД значыцца пад №932) згодна з прадстаўленымі пратаколамі сходаў заснавальнікаў Партыі БХД удзельнічаў аж у дзвюх сходах заснавальнікаў Партыі БХД (пратакол ад 25.01.2009 г. №1 і пратакол ад 22.02.2009 г. №1).

Падчас вывучэння пратаколу схода заснавальнікаў Партыі БХД ад г. Брэста ад 13.02.2009 г. №1 устаноўлена, што ў азначаным пратаколе адсутнічаюць вынікі галасавання па пытаннях, якія разглядаліся на гэтым

сходзе, у тым ліку і аб абранні дэлегатаў Касцюковіч Н.У. і Сацюк В.А. на Устаноўчы З'езд Партыі БХД.

Устаноўлена, што паўнамоцтвы прысутных на Устаноўчым З'ездзе Партыі БХД дэлегатаў мандатнай камісіяй, якая працавала на ўпамянутым з'ездзе, належным чынам правераны не былі. Аб гэтым сведчыць і той факт, што на Устаноўчым З'ездзе Партыі БХД у якасці дэлегатаў прысутнічалі Відэрман У.А., Губарэвіч К.А., Паўлавец Дз.С., Церах С.І., якія не былі абраныя дэлегатамі на Устаноўчы З'езд. Дакументы аб абранні дэлегатаў Касцюковіч Н.У. і Сацюк В.А. на сходзе заснавальнікаў Партыі БХД ад г. Брэста ад 13.02.2009 г. з'яўляюцца юрыдычна нікчэмнымі, паколькі адсутнічаюць вынікі галасавання па ўсіх патыннях, якія разглядаліся на сходзе.

Заснавальнікам дадзенай палітычнай партыі разам з іншымі заснавальнікамі, якія ўказаны ў спісе заснавальнікаў Партыі БХД, выступіў грамадзянін Расійскай Федэрацыі, а іменна, Шведаў С.У. (у спісе заснавальнікаў пад №402). Разам з тым, зыходзячы з нарматыўных прадпісанняў арт. 13 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб палітычных партыях" членамі палітычных партый могуць быць толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам, Устаноўчы З'езд Партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя ад 28.02.2009 г. праведзены са шматлікімі парушэннямі парадка стварэння палітычнай партыі, і гэтыя парушэнні носяць неўстраняльны характар. Дадзеныя акалічнасці згодна з абзацам другім часткі трэцяй арт. 17 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб палітычных партыях" з'яўляюцца падставамі для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі.

У якасці дакумента, які пацвярджае ўплату дзяржаўнай пошліны, у Міністэрства юстыцыі прадстаўлена квітанцыя ад 11.03.2009 аб уплаце гр. Садоўскім Дз.В. суммы у памеры 1 750 000 бел.рублёў. Згодна з інфармацыяй Інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па Першамайскаму раёну г. Мінска (пісьмо ад 24.03.2009 №2-3-22/8387) грашовыя сродкі ў памеры 1 750 000 бел.рублёў па касаваму чэку №170230 ад 11.03.2009 г. на імя Садоўскага Дз.В. залічаныя на рахунак 3602911070066 раздзел 55 падраздзел 20, які згодна з класіфікацыяй даходаў бюджэта, зацверджанай пастановай Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2008 г. №208 "Аб бюджэтнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь" адносіцца да іншых непадатковых даходаў і не з'яўляецца дзяржаўнай пошлінай. Такім чынам, дадзены банкаўскі дакумент не пацвярджае ўплату дзяржаўнай пошліны за дзяржаўную рэгістрацыю Партыі БХД. Гэта значыць, што дакумент банка, які б пацвярджаў уплату дзяржаўнай пошліны за рэгістрацыю Партыі БХД, не прадстаўлены ў рэгіструючы орган.

Вывучэнне прадстаўленага спіса заснавальнікаў Партыі БХД таксама паказала, што частка абавязковых звестак па шэрагу асобаў адсутнічае (нумары хатніх тэлефонаў Драчан Н.В., Халмоўскага А.С., Курыльчык М.П. і іншыя; поўнае месца жыхарства Доўгага В.А.), або яны не адпавядаюць рэчаіснасці (месца жыхарства Цясьлёнак С.В., грамадзянства Шведаў С.У.). Устаноўлена таксама, што шэраг асобаў, якія пералічаны ў спісе заснавальнікаў Партыі БХД, не прымалі ўдзел ні ў адным са сходаў заснавальнікаў Партыі БХД (Андрэеў У.М., Асіпенка М.К., Астаповіч Г.К., Атакулава М.Б. і іншыя), у сувязі з чым азначаных асоб нельга лічыць заснавальнікамі Партыі БХД. Гэта сведчыць пра тое, што фактычна заснальнікі партыі БХД не прадставілі ў Міністэрства юстыцыі спіс заснавальнікаў Партыі БХД па ўстаноўленай форме згодна з дадаткам 2 да пастановы Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 30 жніўня 2005 г. №48 "Аб зацвярджэнні нарматыўных прававых актаў па пытаннях афармлення і рагляду дакументаў, звязаных з дзяржаўнай рэгістрацыяй палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'янанняў, іх саюзаў (асацыяцый), а таксама дзяржаўнай рэгістрацыяй і выключэннем з журнала дзяржаўнай рэгістрацыі, пастаноўкай на ўлік і зняццем з уліка іх арганізацыйных структур" з дакладнымі звесткамі аб заснавальніках палітычнай партыі.

Дадзеныя акалічнасці згодна з абзацам чацвертым часткі трэцяй арт. 17 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб палітычных партыях" з'яўляюцца падставамі для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі Партыі БХД.

На падставе выкладзенага, кіруючыся абзацам чацвёртым часткі трэцяй арт. 16 і абзацамі другім і чацвертым часткі трэцяй арт. 17 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб палітычных партыях", рашэннем Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 10 красавіка 2009 г. у дзяржаўнай рэгістрацыі Партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя адмоўлена.

Гэтае рашэнне можа быць абскарджана ў месячны тэрмін у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

Намеснік Міністра А.А.Сіманаў

Исп. Какуша 2006247
13.04.2009. па выніках разгляду матэрыялаў аб дзярд.рэг.Партыі БХД